УДК 94(476)+378.37 “1921/1939”

# БЕЛАРУСКАЯ СТУДЭНЦКАЯ ПЕРЫЁДЫКА Ў ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ (1921–1939 ГГ.)

***Надзея Слука***
*Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаецца развіццё беларускай студэнцкай перыёдыкі ў Польшчы ў 1921-1939 гг. Падаецца кароткі агляд кожнага выдання: час выхаду, выдаўцы, змест, акалічнасці выдання. Аналізуецца месца студэнцкіх перыядычных выданняў ў беларускім нацыянальным руху.

***Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, перыёдыка, студэнцтва, міжваенны час***

Беларусы ў Польшчы мелі абмежаваныя магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю. Да 1928 г. беларускія школы не мелі права праводзіць дзяржаўныя іспыты на атрыманне атэстата сталасці, які быў патрэбен для паступлення ў вышэйшыя адукацыйныя ўстановы. Таму выпускнікі-беларусы, якія хацелі паступаць у вышэйшыя адукацыйныя ўстановы Польшчы, павінны былі здаваць дзяржаўныя іспыты ў польскіх гімназіях [17, с. 54; 7, с. 259]. Аднак і пасля 1928 г. колькасць беларускіх студэнтаў у польскіх універсітэтах узрасла нязначна, паколькі пераважную колькасць беларускага насельніцтва складала незаможнае сялянства, якое звычайна не мела фінансавых сродкаў, каб аплаціць вучобу ва ўніверсітэце. З гэтай прычыны беларуская моладзь ехала вучыцца за мяжу, найчасцей у Чэхію, дзе існавала магчымасць атрымаць дзяржаўную стыпендыю. Так, Аб’яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый (створанае ў Празе ў 1924 г. студэнтамі-выхадцамі з Заходняй Беларусі) (АБСА) налічавала ў пачатку 1930-х гг. 540 студэнтаў, пры гэтым у Віленскім ўніверсітэце Стэфана Баторыя вучылася 100 чалавек, у іншых вышэйшых адукацыйных установах Польшчы – больш за 100 чалавек (палова з іх – у Варшаве), а каля 300 беларусаў атрымлівалі адукацыю ў Чэхіі, Латвіі, Італіі, Германіі, Бельгіі і іншых краінах [4, с. 22; 18, с. 31].

Беларускі студэнцкі саюз (БСС) быў створаны ў канцы 1921 г., ён дзейнічаў да 1939 г. Колькасць сяброў БСС праз увесь час яго існавання была даволі сціплай. На 01.12.1930 г. у БСС уваходзіла каля 80 студэнтаў, на 01.12.1933 г. – 53 студэнта, на 01.01.1939 г. – 63 студэнта [6, с. 24; 13, арк. 80; 15, арк. 21]. Сябры арганізацыі адзначалі, што да БСС звычайна далучалася не болей за палову студэнтаў-беларусаў універсітэта, астатнія ці ўвогуле ігнаравалі студэнцкія арганізацыі, ці далучаліся да польскіх, якія маглі прадставіць большыя матэрыяльныя выгоды [6, с. 29].

Свой першы друкаваны орган, часопіс “Наш Шлях”, БСС пачаў выпускаць у сакавіку 1922 г. Часопіс падаваў падрабязныя весткі аб жыцці студэнтаў-беларусаў у Вільні, а таксама інфармаваў аб беларускім студэнцтве ў іншых польскіх універсітэтах і за мяжой. У часопісе друкаваліся артыкулы грамадска-культурнага характару, а таксама літаратурныя творы заходнебеларускіх аўтараў. Выдаўцы планавалі выпускаць “Наш Шлях” рэгулярна штомесяц (летам у скарочаным выглядзе), аднак пасля выхаду падвойнага нумара ў маі 1922 г. адбыўся доўгі перапынак і чацверты нумар выйшаў толькі ў снежні 1922 г. [1, с. 1]. На гэтым нумары выхад часопіса спыніўся.

Рэдактарам першых трох нумароў “Нашага Шляху” быў Б. Туронак, чацвеhтры нумар рэдагаваў Л. Мазалеўскі.

Новы часопіс БСС “Студэнцкая Думка” пачаў выдавацца ў снежні 1924 г. Планаваўся штомесячны выпуск, аднак з прычыны грашовай нястачы часопіс выходзіў нерэгулярна; падчас летніх канікул выхад часопіса таксама спыняўся. № 2(3) за 1925 г. быў канфіскаваны ўладамі.

№ 1 за 1924 г., №№ 1(2), 3(4), 4(5), 5(6) за 1925 г. і № 1(7) за 1926 г. “Студэнцкай Думкі” рэдагаваў А. Зянюк.



Полесгу

Пасля з'яўлення адзінага нумара ў сакавіку 1926 г. выхад часопіса спыніўся на паўтары года, аднавіўшыся толькі ў 1928 г. У перыяд з лютага 1928 г. па снежань 1930 г. выдавецкая дзейнасць БСС актывізавалася – выйшла сем нумароў часопіса. Аднак пасля 1930 г. выданне "Студэнцкай Думкі" прыпынілася на доўгі час – да 1935 г. Некалькі разоў урад БСС спрабаваў аднавіць выхад часопіса. У 1932 г. была вызначана рэдкалегія для падрыхтоўкі і выпуску часопіса пад іншай назвай ("Студэнцкі Шлях"), дзеля эканоміі планавалася друкаваць часопіс сваімі сіламі на гектографе, які належыў БСС; у 1934 г. урад абмяркоўваў праэкт па выданню нерэгулярнага "Бюлетэня Беларускага студэнцкага саюзу" [6, арк. 94; 11, арк. 7]. Аднак гэтыя намаганні скончыліся беспаспяхова.

Наступны нумар часопіса (№ 15) выйшаў толькі ў чэрвені 1935 г. У нумары акрамя літаратурных твораў і навуковых артыкулаў была пададзена хроніка дзейнасці БСС за тыя гады, калі "Студэнцкая Думка" не друкавалася. Хоць выдаўцы планавалі працягнуць выпуск пасля летнік канікул, на дадзеным нумары выхад "Студэнцкай Думкі" спыніўся канчаткова.

У "Студэнцкай Думцы" размяшчаліся хронікі дзейнасці БСС, АБСА, агляды жыцця беларускага студэнцтва ў іншых краінах; таксама друкаваліся паэтычныя і празаічныя літаратурныя творы студэнтаў (Я. Бартуля, С. Сарокі, М. Тулейкі, Х. Ільяшэвіча, Я. Бурака) і іншых беларускіх аўтараў (Н. Арсенневай, Г. Леўчыка, М. Васілька), філалагічныя, антрапалагічныя, гістарычныя і прыродазнаўчыя даследаванні студэнтаў-сяброў БСС, а таксама артыкулы некаторых заходнебеларускіх грамадска-культурных дзеячаў (А. Луцкевіч).

Вельмі нерэгулярны выхад "Студэнцкай Думкі" (усяго 14 нумароў за 10 гадоў) тлумачыўся ў першую чаргу абмежаванымі фінансавымі магчымасцямі БСС. Так, бюджэт БСС за 1934 г. складаў 1172 злотых, найбольшую частку з якіх прынеслі канцэрты і вечарыны, а таксама разнастайная матэрыяльная дапамога [6, с. 28]. Гэта была даволі значная сума, аднак большая яе частка пайшла на далейшую арганізацыю вечарын, утрыманне памяшкання і бібліятэкі. Выдаткі на выданне аднаго нумара часопіса складалі ад 175 да 250 злотых – вялікі расход пры дадзеным бюджэце (для параўнання: за 1934 г. студэнтам усяго было выдазена ў якасці пазык ці беззваротнай дапамогі 189 злотых)[13, арк. 16; 9, арк. 43; 6, с. 28].

Аднак сціплыя даходы БСС заўсёды заставаліся адносна стабільнымі. Акрамя прыбыткаў ад вечарын і збору грошаў па падпісных лістах БСС у розныя часы атрымліваў матэрыяльную дамапогу ад розных арганізацый і прыватных асоб: стыпендыі ад Беларускага дабрачыннага таварыства, дапамогу ад Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры, Таварыста беларускай школы (ТБШ), Цэнтральнага саюзу беларускіх культурна-асветніцкіх і гаспадарчых арганізацый; у 1930 г. княгіня М. Радзівіл адправіла грашовую дапамогу для саюзу [19, с. 32; 10, арк. 49]. Таксама БСС атрымліваў субсыдыі ад універсітэцкага рэктарата [11, арк. 18, 31]. БСС за нязначную аплату пазычаў свой гектограф іншым арганізацыям, але "Студэнцкая Думка" тыражавалася толькі друкаваным спосабам [13, арк. 91]. У 1928-1930 гг. часопіс друкаваўся ў Беларускай Друкарні імя Ф. Скарыны, дзе для БСС цана друку была зніжана. Таму грашовая нястача хоць і была значнай перашкодай у выдавецкай працы БСС, аднак не была адзіным фактарам, які ўплываў на рэгулярнасць выхаду часопіса.

Выданню часопіса заміналі непаразуменні паміж сябрамі БСС. Так, у студзені 1935 г. урад БСС прызначыў рэдактарам С. Сароку. Аднак некалькі сяброў БСС выказаліся супраць яго кандыдатуры, і пазней, увесну, урад БСС вызначыў новага адказнага рэдактара – ім стаў М. Якімец [11, арк. 27, 31]. Менавіта з гэтае прычыны нумар часопіса, які планавалі выдаць яшчэ ў пачатку года, выйшаў толькі летам. Таксама выданне часопіса ўскладнялася з-за таго, што сяброўскі склад БСС нязменна аднаўляўся з цягам часу, а разам з ім і ўрад, і рэдакцыя. Так, пасля 1928 г. і да 1935 г. змянілася пяць рэдактараў: № 1(8) і № 2 (9) за 1928 г. рэдагаваў І. Гагалінскі, № 3(10) за 1928 г. і № 1(11) за 1929 г. – Я. Шутовіч, № 1(12) за 1929 г. – М. Шкялёнак, № 2(13) і № 3(14) за 1930 г. – Ст. Станкевіч, а апошні № 1(15) за 1935 г. – М. Якімец. Да таго ж не ўсе сябры БСС адказна ставіліся да сваіх

абавязкаў, разнастайныя ініцыятывы БСС заставаліся нядзейсненымі з-за нядбайнасці з боку тых, каму яны даручаліся. Так, у 1934 г. Ю. Кепель, тагачасны старшыня ўрада БСС, быў часова пазбаўлены правоў сябра БСС менавіта за невыкананне сваіх абавязкаў [13, арк. 24]. У выдавецкай дзейнасці БСС таксама здараліся падобныя выпадкі: у канцы 1933 г. – пачатку 1934 г. для сяброў БСС рабілася сценгазета, аднак яе выхад затрымліваўся менавіта з-за таго, што адказныя за яе выпуск асобы не выконвалі свае абавязкі [11, арк. 3, 11].

Апошнім выданнем БСС стала газета-аднадзёнка "Голас Студэнта", якая выйшла 25 чэрвеня 1937 г. Акрамя хронікі дзейнасці БСС у першай палове 1937 г. і некалькіх празаічных літаратурных твораў пераважная частка артыкулаў у выданні была прысвечана ролі беларускага студэнцтва ў нацыянальным руху. Выдаўцом аднадзёнкі быў В. Ярмалковіч.

Трэба адзначыць, што БСС рэгулярна друкаваў свае абвесткі, хронікі і іншыя матэрыялы на старонках іншых заходнебеларускіх выданнях – у газеце "Беларуская Крыніца", якую выдавала Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), часопісе "Шлях Моладзі", у друкаваным органе ТБШ "Летапіс Таварыства Беларускае Школы". БСС звяртаўся да гэтых выданняў у тыя перыяды, калі ў саюзу не было магчымасці выдаваць свой часопіс, а таксама калі ўзнікала патрэба давесці нейкую інфармацыю да шырокай публікі ці патрэба тэрміновай публікацыі.

Актывізацыя студэнцкай дзейнасці і павялічэнне колькаснага складу БСС пасля 1928 г. прывяла да шэрагу канфліктаў у межах арганізацыі – сярод новых сяброў БСС былі прыхільнікі вельмі розных палітычных плыняў. Згодна са сваім статутам саюз прытрымліваўся апалітычнага кірунку, засяроджваючы сілы на культурна-асветніцкай дзейнасці і падтрымцы ўсяго беларускага студэнцтва незалежна ад палітычных пераваг тых ці іншых сяброў [5, с. 178; 14, арк. 31-32]. Аднак палітычнае драбненне нацыянальнага руху, якое адбывалася ў канцы 1920-х гг. – пачатку 1930-х гг., адбілася і на ўніверсітэцкай моладзі.

У 1929 г. урад БСС выключыў сяброў Ю. Саковіча і Г. Вялецкага з прычыны "дзейнасці на шкоду саюзу" [20, с. 31]. Выключаныя студэнты разам з некалькімі іншымі ўтварылі асобны гурток "паступоўцаў" (прагрэсістаў) і пачалі выдаваць у канцы 1929 г. часопіс "Вольная Думка". Рэдактарам стаў Г. Вялецкі. "Паступоўцы" прытрымліваліся крайніх левых поглядаў, заклікалі да актыўнай сацыяльнай барацьбы і вызвалення працоўных беларусаў. У часопісе друкаваліся разнастайныя матэрыялы, прысвечаныя развіццю рабочага руху ў Заходняй Беларусі і ў свеце, грамадска-культурнаму жыццю ў БССР. У № 2 (снежань 1929 г.) быў размешчаны вялікі артыкул, у якім праводзіўся аналіз твораў К. Маркса і Ч. Дарвіна і сцвярджалася лагічная сувязь паміж дарвінізмам і марксізмам [21]. Таксама "Вольная Думка" друкавала хроніку жыцця беларускага студэнцтва; вяла палеміку са "Студэнцкай Думкай" - выдаўцы абодвух часопісаў падкрэслівалі свае ідэалагічныя разыходжанні і адначасова абвінавачвалі апанентаў у несумленным імкненні выкарыстоўваць студэнцкую арганізацыю дзеля асабістых карыслівых мэтаў [20, с. 31-32; 2, с. 27-28]. Пасля двух нумароў выхад "Вольнай думкі" спыніўся.

У 1931 г. пачаўся новы канфлікт унутры БСС: група сяброў, якая знаходзілася пад ідэалагічным уплывам "беларускай санацыі" (прапольскай групы беларускіх грамадска-палітычных дзеячаў), стварыла асобную беларускую студэнцкую карпарацыю "Скарынія". Раней, у 1930-1931 вучэбным годзе, студэнты-паланафілы ўзначальвалі ўрад БСС, аднак іх актыўнае прасоўванне паланафільскай ідэалогіі і імкненне падпарадкаваць дзейнасць БСС "беларускай санацыі" выклікалі негатыўную рэакцыю з боку іншых сяброў арганізацыі. Напрыклад, у кастрычніку 1930 г. урад БСС звярнуўся да АБСА з прапановай аб утраквізацыі (выданні на двух мовах – беларускай і польскай) часопіса "Студэнцкая Думка" [12, арк. 2]. Прапанова не была прынятая.

Ставарэнне асобнай, яўна паланафільскай, карпарацыі прывяло да адкрытага канфлікта і склікання надзвычайнага агульнага сходу БСС у снежні 1931 г., які забараніў

сябрам БСС уваходзіць у "Скарынію" [3, л. 67; 6, с. 25]. Канфлікт вырашыўся толькі ў сярэдзіне 1932 г., калі паланафілы канчаткова пакінулі БСС. Прапольская "Скарынія" праіснавала да 1934 г., калі супярэчнасці паміж яе сябрамі прывялі да роспуску арганізацыі сенатам універсітэта [8, с. 10].

У 1931-1934 гг. "Скарынія" выпускала свой друкаваны орган – часопіс "Новая Варта". На старонках часопіса друкаваліся гістарычныя даследаванні М. Шкялёнка, грамадска-філасофскія эсэ Я. Бартуля, творы Х. Ільяшэвіча. У №№ 2 і 3 быў надрукаваны вялікі літаратуразнаўчы артыкул А. Луцкевіча, прысвечаны творчасці Я. Купалы і Я. Коласа. Таксама ў часопісе падавалася падрабязная хроніка дзейнасці карпарацыі; значнае месца ў "Новай Варце" адводзілася палеміцы з сябрамі БСС. Адметнай рысай часопіса было тое, што ён друкаваўся выключна лацінкай.

Усяго выйшла тры нумары. Рэдактарам першых двух нумароў быў К. Глінскі, трэці нумар рэдагаваў Т. Грышкевіч. Спыненне выхаду звязана, верагодна, як з непаразуменнямі паміж сябрамі "Скарыніі", так і са скарачэннем фінансавання паланафільскіх арганізацый польскімі ўладамі, якое пачалося пасля канфлікту паміж лідарамі "беларускай санацыі".

Новы студэнцкі часопіс "25 Сакавіка" пачаў выходзіць у лістападзе 1936 г. Яго выдавала група беларускіх студэнтаў, якая прытрымлівалася поглядаў ксяндза В. Гадлеўскага, былога сябра БХД. У 1936 г. ён выйшаў з БХД, паколькі не падзяляў імкненне ксяндза А. Станкевіча да стварэнне агульнага з Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі антыфашысцкага народнага фронту. У тым жа 1936 г. В. Гадлеўскі і Л. Дубейкаўскі разам са студэнтамі В. Папуцэвічам і М. Шкялёнкам пачалі выдаваць газету "Беларускі Фронт", дзе былі акрэслены іх погляды на развіццё беларускага нацыянальнага руху, які, па іх меркаванню, павінен быў шукаць незалежны як ад фашызма, так і ад камунізма шлях. З падобных ідэалагічных падстаў сыходзілі і выдаўцы часопіса "25 сакавіка" – сама назва, якая адсылала да абвяшчэння Беларускай народнай рэспублікі, павінна была падкрэсліваць важнасць выпрацоўкі сваёй асабістай стратэгіі ў нацыянальным будаўніцтве [16, с. 133-134]. Характэрнай рысай часопіса, якая адрознівала яго ад іншых студэнцкіх выданняў, была адсутнасць у ім літаратурных твораў, пераважную частку матэрыялаў, надрукаваных у "25 Сакавіка", складалі аналітычныя і крытычныя артыкулы грамадска-палітычнага характару. Таксама падаваўся агляд падзей з жыцця беларускага студэнцтва. Яшчэ адной своеасаблівай рысай часопіса з'яўлялася тое, што ён, як і часопіс "Новая Варта" карпарацыі "Скарынія", друкаваўся цалкам лацінкай – за выключэннем мастацкі афармленай назвы на першай старонцы. Усяго ў 1936-1938 гг. выйшла 5 нумароў часопіса; №№ 1-2 рэдагаваў В. Папуцэвіч, №№ 3-5 – А. Кабак.

Па-за межамі Вільні актыўная беларуская студэнцкая суполка існавала пры Варшаўскім універцітэце. Студэнты-беларусы ў Варшаве спрабабавалі ў пачатку 1930-х гг. утварыць афіцыйны студэнцкі саюз, аднак не ўсе адукацыйныя ўстановы Варшавы далі на гэта згоду. Адзіным выданнем, якое выпусцілі беларускія студэнты, стала газета-аднадзёнка "Першы крок", якая выйшла ў Варшаве ў ліпене 1935 г. пад рэдакцыяй Ф. Рацэвіча. Акрамя вестак аб студэнцкім жыцці ў аднадзёнцы падаваўся агляд грамадска-палітычнага жыцця ў Польшчы і карэспандэнцыя ад жыхароў Беласточчыны [22, s. 173].

Апошнім выданнем беларускіх студэнтаў у Польшчы стаў дадатак да часопіса "Шлях Моладзі" – "Шлях Беларускага Студэнта". Дадатак выходзіў у складзе "Шляха Моладзі" штомесяц з канца 1938 г. да 1939 г., калі спыніўся і выхад самога часопіса. У выданні рэгулярна падаваліся весткі аб дзейнасці БСС і аб жыцці студэнцтва ў іншых краінах, друкаваліся артыкулы па гісторыі Беларусі, разглядаліся бягучыя падзеі грамадска-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі. "Шлях Беларускага Студэнта" як дадатак да "Шляху Моладзі" рэдагаваў той жа самы рэдактар – Я. Найдзюк. У склад рэдакцыі таксама ўваходзілі В. Ярмалковіч, Ч. Найдзюк, С. Нарушэвіч, У. Панько [22, s. 189]. Аб'ём дадатку быў сціплы, 4 старонкі, таму і матэрыялы ў ім падаваліся ў сціслай форме.

Такім чынам, беларуская студэнцкая перыёдыка ў міжваеннай Польшчы была колькасна вельмі абмежаваная, выходзіла нерэгулярна і з перапынкамі. Прычынамі гэтага

былі нешматлікасць беларускага студэнцтва, фінансавыя цяжкасці, на якія нязменна пакутвалі як асобныя студэнты, так і студэнцкія арганізацыі, а таксама складаныя грамадска-палітычныя ўмовы ў краіне, пераслед беларускага нацыянальнага руху польскімі ўладамі. Аднак нягледзячы на абазначаныя цяжкасці, спробы выдаваць студэнцкія часопісы не спыняліся на працягу ўсяго міжваеннага перыяду. Студэнцтва як адна з найбольш сацыяльна і палітычна актыўных груп беларускага насельніцтва адчувала сталую патрэбу ў сваіх уласных выданнях. Беларусам-студэнтам былі патрэбныя даступныя пляцоўкі для абнародавання сваіх навуковых даследаванняў, а таксама публічная трыбуна для дыскусій на актуальныя тэмы, якая б вынесла гэтыя дыскусіі па-за межы студэнцкага асяроддзя і дазволілі б далучыць студэнцкую дзейнасць да агульнага нацыянальнага руху. Таму перыядычныя выданні беларускага студэнцтва займалі адметнае месца ў беларускай перыёдыцы, якая выходзіла ў Польшчы ў міжваенны час, а таксама мелі важнае значэнне для развіцця беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі.


1. Ад рэдакцыі // Наш Шлях. – 1922. – № 2-3. – С. 1.
2. Адказ // Вольная Думка. – 1929. – № 2. – С. 27-28.
3. Горны, А. С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921-1937 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. С. Горны. – Гродна, 2015. – 172 л.
4. Даклад дэлегацыі “Аб’еднаньня Бел. Студ. Арганізацыяў” аб XII-тым міжнародным студэнскім Кангрэсе ў Бруксэлі (ад 12-га да 26-га жніўня 1930 г.) // Студэнцкая Думка. – № 3(14). – 1930 г. – С. 22-27.
5. Крывуць, В.І. Барацьба за маладое пакаленне Заходняй Беларусі і праўрадавы маладзёжны рух (1926-1939 гг.) / В.І. Крывуць. – Баранавічы : РВА БарДУ, 2013. – 273 с.
6. Летапіс Беларускага студэнцкага саюзу пры Універсітэце Сцяпана Батуры ў Вільні / Студэнцкая Думка. – № 1(15). – 1935. – С. 24-29.
7. Ляхоўскі, У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. Ляхоўскі. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 480 с.
8. Малецкі, Я. Праўда пераможа / Я. Малецкі // Шлях Моладзі. – 1934. – №№ 7-8. – С. 10.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 884. Воп. 1. Спр. 6.
10. НАРБ. – Ф. 884. Воп. 1. Спр. 9.
11. НАРБ. – Ф. 884. Воп. 1. Спр. 19.
12. НАРБ. – Ф. 884. Воп. 1. Спр. 19а.
13. НАРБ. – Ф. 884. Воп. 1. Спр. 22.
14. НАРБ. – Ф. 884. Воп. 1. Спр. 34.
15. НАРБ. – Ф. 884. Воп. 1. Спр. 42.
16. Пагарэлы, А. “За новы тып беларуса”. Часопіс “25 Сакавіка” (1936-1939 гг.) на фоне эпохі / А. Пагарэлы // Arche : Пачатак. – 2008. – № 7-8. – С.120-194.
17. Серпухаў, У. Беларускія студэнцкія арганізацыя Віленскага універсітэта (1919-1939) / У. Серпухаў // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2007. – 28. – S. 54-68.
18. Студэнцкае жыцьцё // Студэнцкая Думка. – № 1(15). – 1935. – С. 31-32.
19. Хроніка // Студэнцкая Думка. – 1926. – № 1. – С. 39-40.
20. Хроніка // Студэнцкая Думка. – 1929. – № 1(12). – С. 30-32.
21. Чарльз Дарвін і Карл Маркс / Вольная думка. – № 2. – 1929. – С. 3-10.
22. Traczuk, J. Czasopiśmiennictwo białoruskie w II Rzeczypospolitej (1918—1939) / Jerzy Traczuk. – Siedlce : Wydawnictwo Uniwersytetu Przyrodniczo-Humanistycznego w Siedlcach, 2013. – 270 s.